Раскажыце, колькі падтэм выкарыстаў аўтар для таго, каб раскрыць тэму. Ці супадаюць яны з абзацамі?

Назавіце апорныя (ключавыя) словы і сказы ў кожнай падтэме. Ці дапамагаюць яны зразумець сэнс тэксту?

> **!** **Апорныя (ключавыя) словы і выразы** — словы, якія перадаюць асноўную інфармацыю тэксту. Гэта могуць быць асобныя словы, спалучэнні слоў і нават цэлыя сказы.

**12.** Запішыце сказы ў такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі. Дайце тэксту загаловак.

1. Зімой, калі за *(?)*окнамі лютуе м..роз. 2. Родная з..мля прыгожа.. *(у/ў)* кожную пару года. 3. Летам, калі нізка над з..млёй, шчабечучы, носяцца ластаўкі, а на палянках густа чырванею*(т/ць)* буйны́я і спелыя суніцы. 4. В..сной, калі стройныя таполі н..смела выпускаю*(т/ць)* клейкія і пахучыя з..лёныя лісточкі. 5. Адна пара́ года змяняе другую, але кожная з іх пасвойму адметная, н..паўторная і прыгожая. 6. Прыгожая наша з..мля і ў*(?)*осень, калі ў кронах б..роз з*(?)*яўляюцца першыя з..латыя лісточкі *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Падкрэсліце апорныя (ключавыя) словы, спалучэнні слоў або сказы.

## § 3. Паглыбленне паняцця пра апавяданне, апісанне і разважанне

**13.** Вызначце, які з тэкстаў з'яўляецца апавяданнем, які — апісаннем, а які — разважаннем. Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**I.** Аднаго разу малы Францішак надумаў зрабіць сабе пячатку. Акуратна вы́разаў на дошчачцы літары, а пасля ўзяў з печы са́жу*, змяшаў са шмальцам* і густа намазаў пячатку. А потым прыклаў яе да тонкага беласнежнага абруса, што ляжаў на стале.

Які жах! Замест прыгожых літар стаялі нейкія незразумелыя знакі. Каб схаваць надпіс, Францішак хуценька перавярнуў абрус. І — о цуд! Пасярод стала́ цяпер зграбна красавалася па-стараславянску выпісанае — слова СКОРИНА *(Паводле А. Клышкі)*.



**II.** Помнік легендарнаму земляку быў устаноўлены ў Полацку ў 1974 годзе. Асновай для помніка Скарыну служыць паверхня ступеньчатага цокаля*, які мае памеры 6 × 8 метраў. Агульная вышыня яго — 12 метраў. У скульптуры вядомы беларускі дзеяч выяўлены апранутым у спадаючую мантыю*, у яго левай руцэ — кніга, сімвал ведаў. Скарына пра нешта засяроджана думае, падпёршы галаву правай рукой.

**III.** Імя Францыска Скарыны вядома амаль кожнаму жыхару Беларусі. Бясспрэчна, ён — наша славутасць, наш гонар.

Сэнс сваёй дзейнасці Скарына бачыў у служэнні народу. Ён выдаў дваццаць тры кнігі Бібліі. Скарына клапаціўся, каб кніга была зразумелай чытачам. Для гэтага на палях лістоў рабіў пераклад на сучасную яму мову і даваў тлумачэнні асобным царкоўнаславянскім словам, якія, на яго думку, маглі быць незразумелымі для простых, малаадукаваных людзей.

Безумоўна, выданне кніг на зразумелай народу мове садзейнічала пашырэнню асветы сярод «простага люду».

**14.** Прачытайце схемы тыпаў маўлення. Раскажыце пра асаблівасці кожнага з іх.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1) | Пачатак дзеяння | → | Развіццё дзеяння | → | Заканчэнне дзеяння |
| 2) | Агульнае ўяўленне аб прадмеце апісання | → | Пералік яго характэрных прымет | → | Ацэнка прадмета, адносіны да яго |
| 3) | Думка, якая даказваецца | → | Доказы думкі | → | Вывад, да якога прыходзіць аўтар |

**15.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып, абгрунтуйце сваё меркаванне.

Хлопчык катаўся на каньках і нечакана праваліўся пад лёд. Дзеці, якія гулялі побач, закрычалі, забегалі. Ніхто з іх не адважыўся кінуцца на дапамогу.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

На шчасце, берагам ішоў салдат. Пачуўшы крыкі, ён скінуў шынель і шапку і скокнуў у ваду. Неўзабаве ён узняў хлопчыка над галавою. Вада была салдату па шыю, і ён пайшоў да берага, крышачы лёд.

Сабраліся людзі. Прыбегла маці хлопчыка. Плача ад радасці, дзякуе салдату, дамоў запрашае абсушыцца. А той выліў ваду з ботаў, накінуў шынель і шпарка пабег у свой ваенны гарадок. Ніхто не паспеў нават імя ў яго спытаць. І ў твар ніхто не запомніў *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Як бы вы назвалі паводзіны салдата? Прывядзіце іншыя прыклады такіх паводзін з прачытаных вамі твораў беларускай літаратуры.

Выпішыце з тэксту апорныя (ключавыя) словы і выразы. Абгрунтуйце свой выбар. Перакажыце тэкст з іх дапамогай. Ці складана было гэта зрабіць?

**16.** Прачытайце тэкст. Пра якія падзеі расказваецца ў ім?

### Напарстачак

Аднойчы ў парку Таня гуляла з сяброўкамі ў хованкі.

Нешта зашамацела побач. Дзяўчынка прыгледзелася. Да яе выпаўз руды, з рэдкай поўсцю звярок. Ён быў з напарстак*. «Трэба ўзяць яго з сабой», — падумала дзяўчынка.

— Тата, — паклікала дзяўчынка бацьку, — глядзі, каго я знайшла!

— Магчыма, гэта шашок, — разважаў бацька. — Але такіх маленькіх я ніколі не бачыў.

«Напарстачка» забралі дамоў. Ён аказаўся вельмі паслухмяным і разумным. Гэта і сапраўды быў шашок. Хутка спінка яго стала чорна-бурай, а жывоцік — колеру спелай саломы. Звярок вельмі любіў гуляць і радаваў усю сям'ю *(Паводле У. Шулякоўскага)*.

Ці адпавядае агульная будова тэксту схеме апавядання? Што з'яўляецца пачаткам дзеяння, як дзеянне развівалася, чым закончылася?

Знайдзіце ў тэксце і зачытайце апісанне звярка. У якіх месцах тэксту яно знаходзіцца?

Як вы думаеце, дзеля чаго аўтар уводзіць у тэкст апісанне?

Апісанне часта ўводзіцца ў апавяданне, каб даць чытачу ўяўленне пра пэўны прадмет ці з’яву, пра якія расказваецца ў апавяданні.

**17.** Спішыце словы, уставіўшы прапушчаныя літары. Знайдзіце гэтыя словы ў папярэднім практыкаванні, зверце з напісаным і растлумачце правапіс. Дапоўніце рады́ двума-трыма ўласнымі прыкладамі на гэта правіла.

Зв..рок, с..броўкі, ...
Мален..кі, вел..мі, ...
Дзя..чынка, выпа..з, ...

**18.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да тыпу апісання.

### Фантан «Беларусь»

У 2006 год..е на плош..ы Незалежнасці ў Мінску з*(?)*явіўся фантан «Беларусь». Яго ўпрыгожваюць тры бронзавыя буслы на в..нку[л] з калос..я, якія сімвалізуюць нашу краіну. Птушкі «ўзлятаюць» над шкляным купалам — дахам пад..емнага гандлёвага ц..нтра. Вакол купала размешчаны выявы гербаў *(?)*абласных ц..нтраў Беларусі.

Па перыметры круглага бас*(?)*ейна б*(?)*е больш за 700 струменяў вады. Шкляны купал адлюстроўвае іх бляск.[сн] Таму ў сонечны дзень фантан нагадвае в..лізны брыл..янт *(Паводле Ю. Барыла)*.

Разгледзьце малюнак фантана на вокладцы падручніка. Ці адпавядае назва фантана яго выяве? Дайце адказ на пытанне, выкарыстоўваючы схему тыпу разважання.

**19.** Прачытайце апорныя словы-дзеясловы. Ці можна па іх здагадацца, якім будзе змест выказвання? Чые дзеянні могуць быць перададзены з дапамогай дзеясловаў?

Падкраўся, упала, падлятала, па́дала, адвяла́, узнялася, паляцела.

Складзіце тэкст, выкарыстоўваючы апорныя словы. Дайце тэксту загаловак.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі